# Дасягненні 2022/2023 навучальнага года

У 2022/2023 навучальным годзе працягвала работу навуковае таварыства вучняў “Квант” (23 вучні).

Прыняты ўдзел у раённым фестывалі даследчых работ дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту “Я – даследчык” (Дзядзела Аліна, ІІІ клас, настаўнік Навуменка Г.І.). Праца вучаніцы і педагога адзначана пасведчаннем удзельніка.

У школьным конкурсе работ даследчага характару прынялі ўдзел 10 навучэнцаў V-IX класаў з 8 работамі. На раённым этапе конкурсу дыпломамі адзначаны даследаванні ў секцыі “Філалогія” (Сакалоўскі Іван, V клас, настаўнік Зубель Т.Ф.), у секцыі “Гісторыя, краязнаўства” (Сакалоўскі Антон, VII клас, настаўнік Зубель Т.Ф.), пахвальнымі лістамі – работы па фізіцы (Тупіга Уладзіслаў, Аксючыц Ілья, IX клас, настаўнік Малашэвіч У.Л.), па беларускай мове (Макарэвіч Валерыя, VIII клас, настаўнік Малашэвіч В.В.). Пасведчанне ўдзельніка атрымаў вучань VII класа Бяльковіч Сцяпан у секцыі “Гісторыя, краязнаўства” (настаўнік Бяльковіч А.М.).

У першым этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах прынялі ўдзел 146 навучэнцаў, у другім – 14 па пяці вучэбных прадметах.

Падчас другога этапу рэспубліканскай алімпіяды найлепшыя вынікі паказалі навучэнка IX класа Грыневіч Злата па біялогіі – 4 месца, навучэнка VIII класа Татаржын Вікторыя па астраноміі – 4 месца, навучэнец VIII класа Валько Вячаслаў па матэматыцы – 5 месца, навучэнка XI класа Сяліцкая Ганна па беларускай мове і літаратуры – 5 месца, навучэнец X класа Уласень Арсеній па геаграфіі – 5 месца, навучэнка XI класа Рошчына Аліна па англійскай мове – 5 месца.

Для параўнання: у 2017/2018 навучальным годзе – 1 дыплом раённага этапу, у 2018/2019 навучальным годзе – 2 дыпломы раённага этапу.

Упершыню за апошнія тры гады прадстаўлены ўдзельнікі другога этапу рэспубліканскай алімпіяды па англійскай мове, астраноміі і грамадазнаўстве.

На працягу навучальнага года вялася падрыхтоўка да раённай дыягнастычнай алімпіяды (15 навучэнцаў па шасці вучэбных прадметах). Удзел у алімпіядзе прынялі 15 чалавек. Дыпломамі ІІ ступені ўзнагароджаны Сакалоўскі Іван, V клас, па матэматыцы (настаўнік Малашэвіч У.Л.), ІІІ ступені – Дзядела Аліна, ІІІ клас, па інтэлектуальным марафоне (настаўнік Навуменка Г.І.), Сакалоўскі Антон, VII клас, па

беларускай мове і літаратуры (настаўнік Малашэвіч В.В.), Бяльковіч Лізавета, IX клас, па гісторыі (настаўнік Пташнік Н.П.).

У 2021/2022 навучальным годзе навучэнцы VIII і X класаў прынялі ўдзел у абласной дыстанцыйнай алімпіядзе па беларускай і рускай мовах, матэматыцы і геаграфіі. Па яе выніках атрыманы тры дыпломы па беларускай мове і літаратуры: I ступені – Сакалоўскі Антон, VII клас, II ступені – Макарэвіч Валерыя, VIII клас, III ступені – Лазоўская Ангеліна, X клас.

Работа па падрыхтоўцы ўдзельнікаў алімпіяды праводзілася на працягу навучальнага года. Арганізаваны заняткі профільных груп X і XI класаў па рускай мове, біялогіі, хіміі, індывідуальныя заняткі па вучэбных прадметах ў канікулярны час. Распрацаваны індывідуальныя праграмы самастойнай работы навучэнцаў па падрыхтоўцы да ўдзелу ў прадметных алімпіядах, арганізаваны факультатыўныя заняткі, псіхалагічнае суправаджэнне высокаматываваных навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў, удзел дзяцей у інтэлектуальных выпрабаваннях асацыяцыі “Конкурс”, у дыстанцыйных і Інтэрнэт-алімпіядах.

Вучні школы прымалі актыўны ўдзел у конкурсах:

- раённы конкурс тэхнічнай творчасці “Думаем.Творым. Вынаходзім” (Язневіч Данііл, дыплом 2 ступені, Верамей Мацвей, дыплом 1 ступені, Тупіга Уладзіслаў, дыплом 3 ступені);
- конкурс малюнкаў “Энергамарафон-2021” (Аўгусціновіч Вікторыя, дыплом 3 ступені);
- абласны этап конкурсу “Выратавальнікі вачыма дзяцей” (дыпломамі адзначаны работы Суранавай Ксеніі, Ульянкі Ганны, Кратовіч Паліны, Грыневіч Златы, Седага Кірыла);
- абласны этап конкурсу “Захоўваем законы дарог” (Язневіч Марыіта, дыплом 1 ступені);
- агляд-конкурс мастацкай творчасці “Здравствуй, мир!” (дыпломамі ўзнагароджаны Аўгусціновіч Вікторыя, Давідзюк Кіра, танцавальны калектыў “Васілінка”);
- раённы конкурс юных чытальнікаў “Жывая класіка” (Язневіч Марыіта, дыплом 2 ступені, Давідзюк Кіра, дыплом 2 ступені, Валько Вячаслаў, дыплом 2 ступені, Бяльковіч Лізавета, дыплом 3 ступені );
- раённая алімпіяда па правілах дарожнага руху (Язневіч Данііл, Верамей Мацвей – дыпломы 1 ступені, Бяльковіч Сцяпан – дыплом 2 ступені ).
- раённая алімпіяда “Школа бяспекі” (Кухта Данііл – дыплом 1 ступені, Хрыстэнка Іван, Бяльковіч Сцяпан – дыпломы 3 ступені).

У школе арганізавана работа атрадаў ЮІР і КЮВП. Удзельнікі КЮВП актыўна прымаюць удзел у злётах юных ратавальнікаў-

пажарных. Сёмы год запар установа адукацыі прымае ўдзел у абласным палявым лагеры “Юны ратавальнік” і злёце Мінскага абласнога аддзялення Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных. У чэрвені 2022 года вучні годна прайшлі ўсе конкурсныя выпрабаванні і занялі шостае месца з 24 раёнаў Мінскай вобласці.

Штогод вучні ўстановы адукацыі прымаюць актыўны ўдзел у раённай спартакіядзе. У 2020/2021 навучальным годзе вынік удзелу – першае месца ў групе В (2020/2021 – IV месца, 2019/2020 – II месца, на працягу папярэдніх пяці год – I месца). Паспяховым з’яўляецца ўдзел школьных спартсменаў не толькі ў раённых, але і ў занальных і абласных спаборніцтвах. Упершыню за некалькі гадоў маецца перамога ў рэспубліканскіх спаборніцтвах па летнім мнагабортве “Здароўе” (Кратовіч Паліна, 2 месца, V клас). Найбольш паспяховыя спартсмены школы, якія праявілі сябе ў розных відах, – гэта Анкуда Арцём, Ільіч Міраслава, Кратовіч Паліна, Грыневіч Злата, Цауна Антон, Стаброўская Ірына, Бяльковіч Сцяпан, Пахомчык Дзіяна і іншыя.

СВЕРНУТЬ

# Дасягненні 2021/2022 навучальнага года

**Работа са здольнымі вучнямі** знаходзілася ў цэнтры ўвагі педагогаў школы. Працягвала работу навуковае таварыства вучняў “Квант” (28 вучняў).

У школьным конкурсе работ даследчага характару (завочны фармат) прынялі ўдзел 7 вучняў 5-9 класаў і 3 вучні агракласа.

Прыродазнаўча-матэматычная секцыя прадставіла 5 работ, грамадска-гуманітарная секцыя – 2 работы, секцыя пачатковай школы – 2 работы.

Работы членаў таварыства маюць практычную накіраванасць, вызначаюцца актуальнасцю выбраных тэм, спробамі юных даследчыкаў да даследвання, аналізу і абагульнення матэрыялу, вылучаюцца лагічнасцю і паслядоўнасцю выкладання, вялікай колькасцю прапрацаваных крыніц для напісання работ даследчага характару.

На раённы фестываль для малодшых школьнікаў “Я –даследчык” былі пададзены 2 заяўкі. Работы вучняў Сакалоўскага Івана “Вырошчваем крышталь” (кіраўнік Мурашка А.В.) і Татаржына Максіма “Як злавіць воблака” (кіраўнік Седая І.К.) прайшлі адборачны тур, прынялі ўдзел у раённым фестывалі даследчых работ і былі адзначаны дыпломамі.

Дастаткова ўвагі даследчай рабоце ў мінулым навучальным годзе ўдзялілі педагогі Асаенка М.Т., Ільіч А.У., Малашэвіч У.Л., Малашэвіч В.В., Мурашка А.В., Седая І.К., Хасяневіч М.І., Шышла Т.В. У наступным годзе больш увагі на значнасць вучнёўскіх даследаванняў неабходна звярнуць педагогам Бяльковіч А.М.,

Віркоўскай А.В., Гапановіч В.Г., Машынскаму К.Р., Навуменка Г.І., Пташнік Н.П., Тупіцынай Г.В.

Штогод вучні ўстановы адукацыі прымаюць актыўны ўдзел у раённай спартакіядзе. У 2019/2020 навучальным годзе вынік удзелу – другое месца ў групе В. Паспяховым з'яўляецца ўдзел школьных спартсменаў не толькі ў раённых, але і ў занальных і абласных спаборніцтвах. Найбольш паспяховыя спартсмены школы, якія праявілі сябе ў розных відах, – гэта Мароз Аляксей, Матусевіч Дзіяна, Надольская Вераніка, Анкуда Арцём, Гайбута Вікторыя, Кароснік Дзмітрый, Грыневіч Злата, Цауна Антон, Стаброўская Ірына, Бяльковіч Сцяпан, Пахомчык Дзіяна і іншыя.

Кожны з педагогаў дадатковай адукацыі стараўся стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця творчых здольнасцей дзяцей. Вучні школы прымалі актыўны ўдзел у конкурсах: раённы конкурс тэхнічнай творчасці "Думаем.Творым. Вынаходзім" (Кароснік Дзмітрый і Ермаковіч Пётр, Дыпломы ІІ і ІІІ ступені), конкурс малюнкаў "Говорим здоровью – Да!" (Дыпломам узнагароджана Грыневіч Злата); абласны этап конкурсу "Крылатая пехота" (Дыплом ІІІ ступені Кароснік Дзмітрый), раённы этап (Дыпломы Пратасевіч Сафія і Тарасава Юлія); агляд-конкурс мастацкай творчасці "Для цябе, мая Вілейка, для цябе, мая зямля" (Дыпломамі ўзнагароджаны ўсе ўдзельнікі ў трох намінацыях); раённы конкурс юных чытальнікаў "Жывая класіка" (Бяльковіч Лізавета, Дыплом ІІІ ступені); раённая алімпіяда па правілах дарожнага руху (Бяльковіч Сцяпан, Дыплом ІІ ступені, Татаржын Вікторыя, Дыплом ІІІ ступені); раённая алімпіяда па асновах бяспекі жыццядзейнасці "Школа бяспекі" (Красоўская Кацярына, Дыплом ІІ ступені); раённы конкурс "Захоўваем законы дарог" (Дыпломамі адзначаны работы Машонскай Аляксандры і Седага Кірыла), раённы этап рэспубліканскай выставы "Салют Перамогі – 75" (Дыпломамі адзначаны Ляшковіч Настасся, Кароль Мацвей, Сяды Яўген, Бяльковіч Лізавета), раённы этап рэспубліканскага праекта для падлеткаў "Бяспечны пераход-2020" (Дыплом пераможцы ў Красоўскай Кацярыны).